Источник: "Мінская праўда" - 2012-12-08



# Заплечнік

## Навіны адпачынку і турызму



*Міншчына*

### У Нацпарк. Па андатру

**У вобласці пачасціліся выпадкі браканьерства, паведаміў «МП» старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Вадзім Варабей.**

У прыватнасці, днямі супрацоўнікі інспекцыі затрымалі грамадзяніна, які ў закрытай для палявання зоне на возеры Мястра на тэрыторыі Нацыянальнага парку «Нарачанскі» з выкарыстаннем самаробных прыстасаванняў злавіў андатру, а на мяжы таго ж Мядзельскага і Вілейскага раёнаў затрыманы гора-паляўнічы, які незаконным чынам здабыў дарослую самку дзіка вагой 100 кілаграмаў. Цяпер па гэтых фактах праводзяцца праверкі. Дарэчы, як нагадаў Вадзім Варабей, парушэнне правіл палявання у залежнасці ад сітуацыі прадугледжвае як адміністрацыйную, так і крымінальную адказнасць.

*Краіна*

### Ёлка-фэст

**Рэспубліканскі адкрыты конкурс Дзядоў Маразоў і Снягурак «Ёлка-фэст-2012» адбудзецца 14 снежня ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.**

Арганізатары фэсту наладзяць навагодні парад-дэфіле, гульні, конкурсы, музычна-харэаграфічныя выступленні. Плюс да таго прадстаўнікі ад усіх рэгіёнаў краіны пазмагаюцца за званне лепшых Дзеда Мароза і Снягуркі.

*Прапанова*

### У трапічным антуражы

**Новы год у тропіках прапануе сустрэць Цэнтральны батанічны сад.**

Свята для дзяцей і дарослых у трапічнай і субтрапічнай частцы аранжарэі пройдзе 15—16 снежня. У праграме — карагоды вакол навагодняй пальмы, бананавая эстафета, бойка сонечнымі снежкамі. Будуць наладжаны прагулкі на конях і поні, а таксама майстар-класы па вырабу калядных і навагодніх вянкоў.

*Чулі?*

### Пераходы для зуброў

**У Белавежскай пушчы абсталяваны тры пераходы для зуброў.**

Пераходы дазволяць зубрам свабодна пераадольваць меліярацыйныя каналы, такім чынам планецца скараціць смяротнасць гэтых жывёлін. Дарэчы, тры гады таму ў Белавежскай пушчы ўжо стварылі некалькі падземных пераходаў пад аўтадарогамі для жаб.

*Зважай*

### Шопінг без падману

**Генконсульства Беларусі ў Беластоку заклікала грамадзян нашай краіны быць пільнымі падчас традыцыйных калядных шоп-тураў у Польшчу.**

Падчас каляднага шопінгу многія жыхары Беларусі становяцца ахвярамі кішэнных зладзеяў і нападаў на аўтастаянках, губляюць кашалькі і дакументы, у выніку чаго ўзнікаюць праблемы з вяртаннем на радзіму. Яшчэ адна вострая тэма — парушэнне правоў спажыўца. Ёсць шмат прыкладаў, калі цана каля тавараў у гандлёвых залах не супадае з цэнамі ў касавых чэках. У сувязі з гэтым, раяць у генконсульстве, пажадана скануваць цэтлікі спецыяльнымі прыстасаваннямі перад пакупкай. Не менш важная парада — не трымаць у адным месцы ўсе грошы і загадзя зрабіць ксеракопію пашпарта.

**Падрыхтавана па матэрыялах БелТА.**

БелТА. Навіны адпачынку і турызму